ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*
*LITERARY SCIENCE*

УДК 82(476)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-490-496

Паступіў у рэдакцыю 10.08.2018
Received 10.08.2018

**І. В. Саверчанка**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ЗДАБЫТКІ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЙ НАВУКІ, ТЭКСТАЛОГІІ І КРЫТЫКІ

**Аннотация**. Представлены основные достижения современного белорусского литературоведения, текстологии и литературной критики. Автор обращает внимание на результаты исследований ведущих ученых Института литературоведения имени Янки Купалы – Евгения Городницкого, Владимира Гниломедова, Михаила Тычино и др. Отмечается высокий научный уровень подготовки Собраний сочинений Ивана Шамякина и Ивана Науменко. Определено позитивное влияние критиков, работающих в Институте литературоведения, на развитие современной белорусской прозы, поэзии, драматургии и публицистики.

**Ключевые слова:** литература, литературоведение, текстология, критика, проза, поэзия, публицистика
**Для цитирования.** Саверчанка, І. В. Здабыткі літаратуразнаўчай навукі, тэксталогіі і крытыкі / І. В. Саверчанка // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 4. – С. 490–496. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-490-496

**I. V. Saverchanka**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre*
*of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## ACHIEVEMENTS OF LITERARY SCIENCE, TEXTOLOGY AND CRITICISM

**Abstract.** In the article the main achievements of modern Belarusian theory of literature, textology and literary criticism are presented. The author draws attention to the results of scientific research by leading scientists of the Yanka Kupala Institute of Literary Studies – Yevgeny Gorodnitsky, Vladimir Gnilamiedov, Mikhail Tychino and others. The high scientific level of preparation of the Collected Works of Ivan Shamyakin and Ivan Naumenko is noted. The positive influence of critics who work in the Institute of Literary Studies on the development of modern Belarusian prose, poetry, drama and publicism is determined.

**Keywords:** literature, theory of literature, textology, literary criticism, prose, poetry, publicism
**For citation.** Saverchanka I. V. Achievements of literary science, textology and criticism. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryya Humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2018, vol. 63, no. 4, pp. 490–496 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-490-496

За апошні час у Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы як каардынуючай навуковай арганізацыі ажыццёўлены буйныя праекты, накіраваныя на развіццё мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства і крытыкі. У галіне тэорыі літаратуры праведзены даследаванні, у якіх падагульнены гістарычны вопыт нацыянальнага слоўнага мастацтва, вызначаюцца асноўныя тэндэнцыі сучаснага літаратурнага працэсу. Тэарэтыкамі літаратуры даследаваны літаратурна-мастацкія напрамкі, плыні і школы, характэрныя для беларускай літаратуры XX–XXI стст., раскрыты жанрава-стылявыя і моўныя асаблівасці літаратурных твораў. Вызначаны мастацка-эстэтычныя законы і катэгарыяльна-паняційны апарат сучаснай літаратурнай тэорыі; выяўлены змены ў прыродзе, мэце і задачах сучасных літаратурных ведаў; акрэслены прыярытэтныя напрамкі творчага пошуку і распрацаваны мадэлі інавацыйных стратэгій беларускага літаратуразнаўства.

© Саверчанка І. В., 2018

Даследчыкамі старажытнай беларускай літаратуры выяўлены і асэнсаваны творы эпохі Готыкі і Адраджэння, Барока і Асветніцтва з выкарыстаннем метадаў герменеўтыкі. Вывучэнне фенаменалогіі, паэтыкі і эстэтыкі даўняй беларускай літаратуры дало магчымасць вызначыць вытокі багатай эпічнай традыцыі, раскрыць асноўныя этапы эвалюцыі мастацкай літаратуры ад ранніх форм (запісы, замалёўкі, навелы) да складаных сінтэтычных твораў (аповесць, хроніка, раман). Сувязь паміж літаратурай мінулых эпох і сучаснай літаратурай даследавалася ў плане раскрыцця індывідуальнага пісьменніцкага майстэрства і суадносін нацыянальнага і агульначалавечага.

У адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15.05.2006 г. № 177рп "Аб увекавечванні памяці народнага пісьменніка Беларусі Шамякіна Івана Пятровіча" быў выдадзены Збор твораў Івана Шамякіна ў 23 тамах. Лагічным працягам працы з'явілася абагульненне назапашанага тэкстолагамі вопыту і напісанне калектыўнай манаграфіі "Тэксталогія твораў Івана Шамякіна: па выніках выдання Збору твораў у 23 тамах", прысвечанай актуальным пытанням тэксталогіі твораў народнага пісьменніка. У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1171 ад 15.08.2008 г. праведзена навукова-тэксталагічнае даследаванне твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі. Завершана праца па падрыхтоўцы матэрыялаў усіх тамоў 10-томнага Збору твораў І. Навуменкі. З друку выйшла 7 тамоў выдання. Даследчыкамі літаратурных узаемасувязей прапанавана новая методыка аналізу нацыянальных тыпаў ментальнасці ў беларускай і еўрапейскіх літаратурах.

Акрамя ўдзелу ў дзяржаўнай праграме навуковых даследаванняў, навуковыя кадры Інстытута рэгулярна праводзяць літаратуразнаўчыя даследаванні ў рамках асобных праектаў і Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў.

Навукоўцамі інстытута апублікаваны абагульняючыя гісторыка-тэарэтычныя працы, буйныя манаграфіі і значныя калектыўныя даследаванні. Лепшыя літаратуразнаўчыя выданні апошняга часу спрыяюць развіццю навукі, адукацыі і нацыянальнай культуры. Вельмі важнае значэнне мае "Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т." (Мінск: Беларус. навука, 1999–2014). Фундаментальнае даследаванне літаратурнага працэсу нашай краіны выйшла ў шасці кнігах. Унікальная, маштабная па сваёй навуковай значнасці праца створана вялікім калектывам аўтараў і рэдактараў. Кожная кніга выдання ўключае раздзелы агульнага разгляду па паэзіі, прозе, драматургіі, крытыцы і літаратуразнаўстве. У персанальных артыкулах, прысвечаных творчасці буйных пісьменнікаў, раскрываюцца нацыянальная спецыфіка беларускай літаратуры, яе роля і значэнне ў паглыбленні грамадскай свядомасці, выхаванні нацыянальнага самаадчування, патрыятызму і гуманізму, паказаны ўвесь патэнцыял беларускай духоўнай культуры ў галіне мастацкага слова на працягу стагоддзя, яе ідэйна-эстэтычнае багацце і непаўторнасць. Упершыню ў гісторыю айчыннай літаратуры ўключаны разгляд і аналіз набыткаў беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны і літаратараў-эмігрантаў. Ацэнка знакавых мастацкіх з'яў, складанай сувязі пісьменніка з часам і грамадскай атмасферай грунтуецца на прынцыпах гістарызму, праводзіцца з улікам новых навуковых падыходаў, у адпаведнасці з сучаснымі гуманістычнымі, дэмакратычнымі патрабаваннямі. У кожным томе змешчаны раздзелы багатай на факты і падзеі хронікі літаратурнага жыцця.

Заўважнай з'явай у навуковым жыцці стала манаграфія М. І. Мушынскага "Мае Каласавіны: з вопыту вывучэння літаратурнай і грамадска-культурнай дзейнасці Якуба Коласа" (Мінск: Беларус. навука, 2016. – 419 с.) У кнізе шматгранная літаратурная спадчына Якуба Коласа разглядаецца як мастацка-духоўны складнік грамадскага жыцця на сучасным этапе. Даследуюцца недастаткова вывучаныя аспекты творчасці: пісьменнік і яго асяроддзе; паэмы "Новая зямля", "Сымон-музыка" і ўзровень іх перакладу на іншыя мовы; жанравая прыналежнасць ліра-эпічнага твора "На шляхах волі". Зроблена спроба ўдакладніць ранейшыя ацэнкі шэрага твораў.

У кнізе С. С. Лаўшука "Праз церніі да брамы неўміручасці: Кандрат Крапіва і беларуская драматургія" (Мінск: Беларуская навука, 2016. – 267 с.) даследуецца драматургічная творчасць аднаго з найбуйнейшых беларускіх пісьменнікаў ХХ ст., народнага пісьменніка БССР, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР Кандрата Крапівы. На шырокім фактычным матэрыяле, грунтуючыся на прынцыпах гістарызму і з улікам новых навуковых падыходаў, прасочваецца

станаўленне творчай індывідуальнасці К. Крапівы-драматурга ў кантэксце развіцця ўсёй беларускай драматургіі.

Аўтарытэтны даследчык М. А. Тычына апублікаваў манаграфію “Народ і вайна” ( Мінск: Беларус. навука, 2015. – 433 с.), прысвечаную 70-годдзю з Дня Вялікай Перамогі над фашызмам у Вялікай Айчыннай вайне. У цэнтры ўвагі – праблема “народ і вайна”, адлюстраванне Вялікай Айчыннай вайны ў народнай памяці і ў беларускай літаратуры, мастацкія асаблівасці эстэтычнага асэнсавання вайны ў беларускай прозе і літаратуры іншых народаў, удзельнікаў Другой сусветнай вайны. Увага засяроджваецца на творчасці класікаў беларускай нацыянальнай літаратуры і сучасных беларускіх і замежных празаікаў. Падзеі вайны моцна паўплывалі на развіццё беларускай культуры, літаратуры і мастацтва. Створаны беларускімі пісьменнікамі вобраз вайны ўражвае не толькі беларусаў, але і прадстаўнікоў нашых блізкіх і далёкіх суседзяў.

У наватарскай манаграфіі Я. А. Гараднiцкага “Па абодва бакі тэксту: увасабленні, інтэрпрэтацыі” (2018) разгледжана праблема аўтара і аўтарства ў літаратурнай творчасці, вызначана ступень прысутнасці стваральніка літаратурнага твора ў тэксце, раскрыта сувязь паэтыкі твора з аўтарскімі інтэнцыямі і светабачаннем. Пастаноўка праблемы аўтара ў сучасным літаратуразнаўчым дыскурсе асабліва актуальная ў сувязі з пашыраным у наш час меркаваннем пра змяншэнне ролі аўтарскага пачатку ў літаратуры. Даследчык, паказваючы значэнне аўтара як творцы мастацкага свету літаратурнага твора, разглядае апошні як апасродкаванае звяно ў творчым дыялогу аўтара і чытача. Прысутнасць аўтара выяўляецца, паводле яго канцэпцыі, праз стыль і паэтыку, праз суадносіны пунктаў гледжання аўтара, апавядальніка і герояў, праз наратыўныя прыёмы і спосабы маўленчай арганізацыі.

Сучасны літаратурны працэс уважліва аналізуе Г. М. Кісліцына ў манаграфіі “Культурны градыент: ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў” (Мінск: Права і эканоміка, 2015. – 345 с.). У кнізе разглядаюцца тыя працэсы, якія змянілі беларускую культуру ў апошняй чвэрці мінулага стагоддзя. Аб’ектам увагі сталі самыя цікавыя з’явы сучаснага літпрацэсу, знакавыя мастацкія тэксты і маніфесты літаратурных суполак, а таксама крытычныя артыкулы і дыскусіі, якія з’яўляліся на старонках беларускіх газет і часопісаў. Аўтар аналізуе творы як жывых класікаў літаратуры, так і тых, каго сёння называюць “пакаленнем нулявых”. Даследчык спрабуе акрэсліць супярэчлівы вобраз сучасніка на матэрыяле самых яркіх прадстаўнікоў беларускай прозы канца XX – пачатку XXI ст.

Адметнай з’явай нацыянальнай філалагічнай культуры стала кніга ўспамінаў “Дарыў Святло сваёй душы людзям і Айчыне” (Мінск: Беларус. навука, 2015. – 221 с.), прысвечаная Юльяну Сяргеевічу Пшыркову (1912–1980), доктару філалагічных навук, прафесару, заслужанаму дзеячу навукі БССР. Ён унёс вялікі ўклад у развіццё беларускага літаратуразнаўства, быў адным з заснавальнікаў беларускага айчыннага коласазнаўства, сааўтарам (разам з Н. С. Перкіным) школьнага падручніка па беларускай літаратуры для 8–10-х класаў.

У манаграфіі І. В. Саверчанкі “Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стст.” (Мінск: Беларус. навука, 2012. – 463 с.) асветлена багатая інтэлектуальная культура Беларусі эпохі Рэнесансу і Барока, прааналізаваны галоўныя тэмы і праблемы, якія ўзнімаліся на старонках публіцыстычных твораў, паказаны ключавыя аспекты дыскусій і лініі ідэйнай барацьбы паміж пісьменнікамі-інтэлектуаламі, прадстаўнікамі розных філасофска-рэлігійных плыняў. Упершыню ў філалагічнай навуцы раскрыта паэтыка і семіётыка старабеларускай публіцыстычнай літаратуры XVI–XVII стст., выяўлены яе асноўныя мастацка-эстэтычныя і жанравыя формы. Вызначаны семантычныя дамінанты і структурна-кампазіцыйныя кампаненты публіцыстычных твораў, акрэслены прынцыпы і ўстойлівыя заканамернасці ўнутранай арганізацыі публіцыстычнага дыскурсу. Выяўлены тыпы аргументаў, што ўжываліся ў старабеларускай публіцыстыцы; паказана шчыльная сувязь публіцыстычнага пісьменства з навуковым дыскурсам. Устаноўлена спецыфіка выкарыстання базавых мастацка-выяўленчых мікраэлементаў (тропаў, фігур, рытмікі) у творчасці таленавітых пісьменнікаў-публіцыстаў, ажыццёўлена іх тыпалогія і вызначана канкрэтная семантычная і функцыянальная разнастайнасць.

Маладая даследчыца Т. Б. Мацюхіна апублікавала цікавую працу “Беларускі імпрэсіянізм” (Мінск: Беларус. навука, 2015. – 202 с.). У кнізе разглядаецца прырода жывапіснага і літаратурнага

імпрэсіянізму, выяўлены яго тыпалогія і спецыфічныя ўласцівасці ў нацыянальным кантэксце (на прыкладзе творчасці М. Багдановіча, У. Дубоўкі і інш.). Вызначаны заканамернасці і ўмовы станаўлення імпрэсіянізму ў беларускай літаратуры пры апоры на вобразна-эстэтычны і тэарэтычны грунт. Імпрэсіянізм як мастацкая з'ява паказаны ў культурна-гістарычным кантэксце беларускай літаратуры, дзякуючы чаму раскрываецца псіхалогія мыслення і ўспрымання мастацкіх твораў, а таксама магчымасці імпрэсіяністычнага пісьма.

Напрыканцы 2017 г. у выдавецтве "Беларуская навука" выйшла кніга "Літаратура. Гісторыя. Свядомасць", падрыхтаваная вядомымі і прызнанымі навукоўцамі: доктарам філалагічных навук, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі У. В. Гніламедавым і кандыдатам філалагічных навук, загадчыкам аддзела ўзаемасувязей літаратур Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М. М. Мікулічам. Значнасць кнігі заключаецца, у першую чаргу, у тым, што ў ёй у сканцэнтраваным выглядзе падаецца гісторыя развіцця беларускага прыгожага мастацтва: ад яе вытокаў, пачынаючы ад Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, да станаўлення і сталення беларускай літаратуры ў ХХ ст. Не застаецца па-за ўвагай аўтараў і літаратурны працэс на мяжы новага стагоддзя, з характэрным яму абнаўленнем жанравай парадыгмы. Назіраецца скрупулёзны падыход да адбору матэрыялаў – мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў, на аснове якіх робяцца аб'ектыўныя абагульненні, прызваныя ахарактарызаваць аб'ект даследавання найбольш поўна, усёабдымна. Такімі матэрыяламі становяцца знакавыя для развіцця беларускага прыгожага мастацтва слова творы, дзе найбольш ярка рэпрэзентаваны вопыт таго ці іншага пакалення пісьменнікаў (у дачыненні да літаратуры ХХ і ХХІ стст.) або цэлай эпохі.

Каштоўнасць нарысаў "Літаратура. Гісторыя. Свядомасць" – у сістэмным падыходзе да аб'екта вывучэння, у пошуку своеасаблівага літаратурнага інтэграла, той велічыні, што ўвабрала ў сябе асноўныя складнікі нацыянальнага прыгожага мастацтва слова. Працэс узаемадзеяння грамадска-гістарычнага і мастацка-літаратурнага жыцця, па-першае, разгледжаны аўтарамі не выбарачна, не эскізна, а ўсёахопна, як з'ява цэласная – ад старажытнасці да сучаснасці, а па-другое – як працэс рознаскіраваны і ўзаемаабумоўлены: кожны перыяд напоўнены канкрэтным зместам – паказана, як у залежнасці ад гістарычных, грамадска-палітычных абставін мянялася ўздзеянне на літаратуру, якая ў сваю чаргу ўплывала на нацыянальную самасвядомасць грамадства.

Манаграфія С. У. Калядкі "Максім Танк: новыя факты, матэрыялы, інтэрпрэтацыі" адрозніваецца наватарствам і складаецца з дзвюх частак: даследчай (у ёй два раздзелы з падраздзеламі) і дадатку (у ім змешчаны вершы паэта, якія нідзе не публікаваліся, чарнавыя накіды і белавыя, чарнавыя варыянты твораў, якія сутнасна адрозніваюцца ад апублікаваных; два тэксты незавершаных паэм; аўтабіяграфія (значна пашыраная, больш падрабязная, чым апублікаваная ў прыжыццёвых выданнях); выбраныя інтэрв'ю (у тым ліку надрукаваныя на польскай і славацкай мовах); завяшчанне; неапублікаваныя лісты М. Танка да В. П. Рагойшы; пераклад; справаздача; рэкамендацыя; рэцэнзіі; даведкі; некралогі і інш.). У дадатку прадстаўлены 460 варыянтаў і новых вершаў Максіма Танка, з якімі чытач можа азнаёміцца ўпершыню. У кнізе прадстаўлены шматлікія матэрыялы са спадчыны Максіма Танка, якія не ўвайшлі ў Збор твораў Максіма Танка ў 13 тамах.

Значным уяўляецца зборнік "Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў літаратуры" (Мінск: Права і эканоміка, 2015. – 495) , у які ўвайшлі матэрыялы навуковых даследаванняў, прадстаўленых удзельнікамі Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І. Я. Навуменкі. У кнізе асвятляюцца новыя аспекты вывучэння празаічнай, публіцыстычнай і навуковай спадчыны І. Я. Навуменкі, беларускай літаратурнай класікі. Разглядаюцца актуальныя пытанні літаратуразнаўства, а таксама традыцыі літаратуры ХХ ст. у найноўшым літаратурным працэсе.

У кнігу "Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства" (Мінск: Права і эканоміка, 2016. – 396 с.) увайшлі матэрыялы навуковых даследаванняў, прадстаўленых удзельнікамі Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка Кандрата Крапівы (Мінск, 3–4 сакавіка 2016 г.). У кнізе асветлены новыя аспекты вывучэння празаічнай, публіцыстычнай і навуковай спадчыны Кандрата Крапівы, беларускай літаратурнай класікі, актуальныя пытанні літаратуразнаўства, а таксама традыцыі літаратуры ХХ ст. у найноўшым літаратурным працэсе.

Супрацоўнікамі Інстытута праведзена вялікая тэксталагічная праца па падрыхтоўцы і выданні збораў твораў класікаў беларускай літаратуры: Якуба Коласа – у 20 тамах (2007–2012); Максіма Танка – у 13 тамах (2006–2012); Івана Шамякіна – у 23 тамах (2011–2015); Івана Навуменкі – у 10 тамах (2012–2016). Пачалася праца над выданнем збору твораў Янкі Брыля ў 10 тамах. Зборы твораў атрымалі высокую ацэнку навуковай грамадскасці як доказ больш высокага прафесійнага ўзроўню выдання шматграннай спадчыны народных паэтаў/пісьменнікаў і новага ўзроўню развіцця беларускай тэксталогіі. Зборы твораў скіраваны на далейшую актывізацыю беларускага літаратуразнаўства, на паглыбленае вывучэнне ўнутраных заканамернасцей гісторыка-літаратурнага працэсу, на аб'ектыўнае асвятленне ролі класічных традыцый у выпрацоўцы нацыянальнага стылю, у жанравым узбагачэнні беларускага прыгожага пісьменства.

Інстытут літаратуразнаўства спрыяе выданню твораў мастацкай літаратуры – як сучаснай, так і даўняй. Такі від дзейнасці патрабуе высокапрафесійнай апрацоўкі тэкстаў. Толькі за апошні час выдадзены фундаментальныя серыі помнікаў пісьменства і літаратуры з капітальнымі навуковымі каментарыямі і разгорнутымі ўступнымі артыкуламі.

У акадэмічнай серыі выйшла кніга "Беларуская літаратура X–XV стст." (Мінск: Беларус. навука, 2010. – 410 с.), падрыхтаваная І. В. Саверчанкам. У ёй у перакладзе на сучасную беларускую мову і ў адаптаваным выглядзе друкуюцца мастацкія шэдэўры беларускага прыгожага пісьменства X–XV стст.: "Сказанне пра запрашэнне варагаў", "Занатоўкі пра Рагнеду", "Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства", "Аповеды пра Усяслава Чарадзея", "Полацкі летапіс", "Аповесць жыцця і смерці Ефрасінні Полацкай", "Хаджэнне" ігумена Данііла, "Слова пра князёў", нарацыі, павучанні і малітвы Кірылы Тураўскага, творы Кліма Смаляціча, Аўрама Смаленскага і Рыгора Цамблака, "Хроніка грамадзянскай вайны", "Аповесць пра паўстанне ў Смаленску", летапісы, хронікі і навелы пра дзейнасць вялікіх князёў – Міндоўга, Войшалка, Трайдзеня, Віценя, Гедыміна, Альгерда, Ягайлы, Вітаўта і Казіміра. У разгорнутых уступных артыкулах раскрываюцца ідэйныя і мастацка-эстэтычныя вартасці рарытэтных помнікаў старадаўняй беларускай літаратуры. Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў – навукоўцаў, выкладчыкаў ВНУ і каледжаў, настаўнікаў, студэнтаў і школьнікаў.

У другой кнізе "Беларуская літаратура XVI ст." (Мінск: Беларус. навука, 2015. – 570 с.) у перакладзе на сучасную беларускую мову і ў адаптаваным выглядзе друкуюцца найбольш значныя творы выдатных пісьменнікаў-інтэлектуалаў эпохі Рэнесансу – Іосіфа Солтана, Францыска Скарыны, Стэфана Збаражскага, Аўгусціна Ротундуса, Рыгора Хадкевіча, Сымона Буднага, Міхаіла Гарабурды, Філона Кміты-Чарнобыльскага, Васіля Цяпінскага, Андрэя Рымшы, Льва Сапегі, Лявона Мамоніча, Лаўрэнція Зізанія, Іпація Пацея, Крыштофа Філалета, а таксама хронікі, летапісныя аповесці, навелы, пахвалы і палемічныя творы. Ва ўступе і ў разгорнутых артыкулах-каментарыях раскрываецца паэтыка творчасці беларускіх майстроў слова XVI ст., асвятляюцца іх ідэйна-мастацкія пошукі, паказваюцца эстэтычныя вартасці шэдэўраў даўняга беларускага пісьменства.

Вучоны-медыявіст А. У. Бразгуноў падрыхтаваў том "Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст." (Мінск: Беларус. навука, 2011. – 901 с.). У кнізе прадстаўлены шэдэўры айчыннай паэтычнай спадчыны, якія былі створаны па-старабеларуску і па-старапольску ў часы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XVI–XVIII стст. і сёння складаюць супольны культурны набытак беларускага, літоўскага, польскага і ўкраінскага народаў. Упершыню ў арыгіналах і перакладах на сучасную беларускую мову падаюцца поўныя тэксты твораў такіх пісьменнікаў, як Ц. Базылік, С. Кулакоўскі, С. Полацкі, Я. Б. Пратасовіч, У. К. Радзівіл, Ф. У. Радзівіл, Д. Рудніцкі, А. Рымша, М. Стрыйкоўскі і інш.

Вялікую каштоўнасць уяўляе том "Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст." (Мінск: Беларус. навука, 2013. – 719 с.). У кнізе прадстаўлены цяжкадаступныя для сучаснага даследчыка і аматара айчыннага пісьменства творы, якія захоўваюцца ў рукапісах, як правіла, за межамі Беларусі. Гэтыя помнікі былі створаны на старажытнарускай, старабеларускай, а таксама царкоўнаславянскай (мясцовых рэдакцый) мовах у часы Кіеўскай Русі і Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XI–XV стст. і складаюць аснову культурагенезу і духоўнага быцця беларускага народа.

Аўтарытэтны вучоны В. А. Чамярыцкі падрыхтаваў і апублікаваў “Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага (XV–XVII стст.)” ( Мінск: Беларус. навука, 2015. – 479 с.). У кнізе прадстаўлена навуковае каментаванае выданне старабеларускіх летапісаў і хронік, ажыццёўленае на старабеларускай мове: “Летапісу вялікіх князёў літоўскіх”, “Хронікі Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага”, “Хронікі Быхаўца” і Баркулабаўскага летапісу, якія складаюць значны пласт гістарычнага пісьменства, цікавы ў літаратурных і інфармацыйных адносінах.

Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы каардынуе серыйнае выданне “Залатая калекцыя беларускай літаратуры” у 50 т. У ім выйшлі ўжо 16 тамоў класічнай беларускай літаратуры, у тым ліку: “Літаратура XI–XVI стагоддзяў”: зборнік; уклад. і камент. А. У. Бразгунова, І. У. Будзько, Л. В. Ляўшун; прадмова У. В. Гніламедава; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі (Мінск: Мастацкая літаратура, 2011. – 766 с.); “Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў”: зборнік; уклад. А. У. Бразгунова, С. Л. Гараніна; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі (Мінск: Мастацкая літаратура, 2012. – 830 с.)

Такім чынам, Інстытут літаратуразнаўства трымае пад увагай актуальныя праблемы рэпрэзентацыі беларускай мастацкай літаратуры, займаецца ліквідацыяй прабелаў шляхам выдання лепшых аўтараў і твораў, рыхтуе выданні згодна з патрабаваннямі часу і дасягненнямі тэксталагічнай навукі.

Супрацоўнікі Інстытута ўносяць значны ўклад у развіццё літаратурнай крытыкі, якая апошнім часам застаецца праблемным бокам літаратурнага працэсу. Сярод вядомых крытыкаў на сучасным этапе шмат супрацоўнікаў Інстытута. У гэтай галіне яны выступаюць галоўным чынам на грамадскіх пачатках. Назавём найбольш актыўных: Ганна Кісліцына, Серж Мінскевіч, Аляксандра Чарнавокая, Таццяна Барысюк, Яўген Гарадніцкі, Анатоль Трафімчык, Святлана Калядка, Мікалай Мікуліч, Таццяна Мацюхіна. Яны друкуюцца, як правіла, у літаратурна-мастацкіх выданнях: часопісах “Маладосць” “Нёман”, “Верасень”, “Переходный возраст” і “Полымя”, газетах “Звязда” і “Літаратура і Мастацтва”. Нярэдка супрацоўнікі Інстытута запрашаюцца ў якасці журы на літаратурныя конкурсы і фестывалі. Сярод іх адзначым: Ганну Кісліцыну, Сержа Мінскевіча, Юлію Масарэнка, Анатоля Трафімчыка.

Вынікі крытычнай аналітыкі пералічаных асоб рэгулярна з’яўляюцца не толькі на старонках дзяржаўнага друку, але і за мяжой, у прыватнасці ў выданні “Тэрмапілы” (Польшча).

На экспертызу супрацоўнікам Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Міністэрства культуры пастаянна накіроўвае матэрыялы аўтараў, якія прэтэндуюць на статус творчага работніка. Экспертыза мае аналітычны характар. Яе вынікі не заўсёды станоўчыя для прэтэндэнтаў. У ліку найбольш выніковых экспертаў – Алена Вальчук, Алесь Лапата-Загорскі, Яўген Гарадніцкі, Аляксандр Бараноўскі, Ігар Шаладонаў, Алена Манкевіч.

Значнае месца ў дзейнасці супрацоўнікаў Інстытута традыцыйна займае папулярызацыя лепшых здабыткаў мастацкай літаратуры – як сучаснасці, так і гісторыі. З такой мэтай рэгулярна адбываюцца выступленні на культурных мерапрыемствах – ад звычайных прэзентацый кніг да фестываляў дзяржаўнага ўзроўню (напрыклад, на Днях пісьменства), а таксама выступленні на радыё і тэлебачанні (асабліва на канале “Культура”). Крытыкі прымаюць удзел у living рознатэматычных круглых сталах і семінарах.

Сярод найбольш актыўных за апошні час крытыкаў неабходна адзначыць Сержа Мінскевіча, Сцяпана Лаўшука, Таццяну Барысюк, Алену Васілевіч, Міхася Тычыну, Ганну Кісліцыну.

Такім чынам, супрацоўнікі Інстытута актыўна ўдзельнічаюць у літаратурным працэсе Беларусі, шмат публікуюцца і прымаюць удзел у грамадскім жыцці краіны. Гэта значна ажыўляе беларускую літаратурную крытыку.

Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы з’яўляецца цэнтральнай установай па арганізацыі літаратуразнаўчай навукі ў Рэспубліцы Беларусь. Інстытут адказны за літаратурную частку падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў (якая распрацоўваецца на кожную пяцігодку, актуальная на 2016–2020 гг., мае назву «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства»). У бягучай пяцігодцы ў рамках праграмы выконваюць працу 30 калектываў з розных устаноў краіны, дзякуючы чаму фактычна ахоплены ў асноўным усе спецыялісты ў галіне літаратуразнаўчай навукі Беларусі.

Літаратуразнаўчая частка падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў у бягучай пяцігодцы ўключае пяць літаратуразнаўчых заданняў: “Слоўнае мастацтва Беларусі і сусветны літаратурны працэс”; “Беларуска-рускія літаратурныя ўзаемасувязі: гісторыя, сучасны стан, перспектывы ўмацавання і развіцця”; “Літаратурны працэс на Беларусі ў дыялектычнай сувязі мінулага і сучаснага: праблемы тэарэтычнага асэнсавання, тэксталогія, аксіялогія”; “Герменеўтыка і фенаменалогія беларускай літаратуры”; “Развіццё сучаснай беларускай літаратуры: ідэйныя пошукі, жанравая структура, нацыянальная адметнасць”.

Такім чынам, Інстытут літаратуразнаўства з’яўляецца цэнтральнай установай у структуры навуковых ўстаноў Рэспублікі Беларусь па вывучэнні мастацкай літаратуры. Праз Інстытут арганізуецца вырашэнне дзяржаўных задач, якія ўзнікаюць у літаратурным працэсе. Паколькі творчасць мае ў многім характар стыхійны, паўстае неабходнасць яе паслядоўнага і сістэмнага асэнсавання. Гэту ролю выконвае менавіта Інстытут. Прычым літаратура разглядаецца не толькі ў плоскасці літаратуразнаўчай навукі (гэта, безумоўна, галоўная функцыя Інстытута), але і праз прызму прафесійнай крытыкі. Асаблівае значэнне мае работа па захаванні і рэтрансляцыі беларускай класічнай літаратуры, якая рэгулярна вядзецца ў Інстытуце з часу яго заснавання.

Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы адыгрывае важную ролю ў вывучэнні прыгожага пісьменства, ажыццяўляе ўсебаковыя даследаванні мастацкай літаратуры – стрыжнявога кампанента нацыянальнай культуры, актыўна ўдзельнічае ў захаванні літаратурнай спадчыны Беларусі.


## Информация об авторе

**Саверченко Иван Васильевич** – доктор филологических наук, профессор, директор Института литературоведения им. Янки Купалы. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: inlinasbel@tut.by

## Information about the author

**Ivan V. Saverchanka** – D. Sc. (Philol.), Professor, Director of the Institute of Literary Studies named after Yanka Kupala. Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: inlinasbel@tut.by